**Коган, І.** Я нізка схіляю галаву… / І. Коган // Аршанская газета. — 1996. — 15 лют. — С. 1.

## Я НІЗКА СХІЛЯЮ ГАЛАВУ…



*«Я нізка схіляю галаву перад бацькамі, роднымі, блізкімі, перад памяццю паўшых воінаў былой Савецкай Арміі, якім давялося ваяваць у Афганістане. Яны ўжо ніколі не пераступяль парог бацькоўскага дома, ніколі не абдымуць любых жонак, дзяцей, каханых. 1, паверце мне, памяць пра ўсіх, хто загінуў у далёкай скаліста-горнай краіне, заўсёды будзе жыць у нашых сэрцах, сэрцах тых, хто побач з імі ваяваў, хоць па праўдзе, ваяваў, не ведаючы за што і дзеля чаго».*

Гэта словы ўдзельніка афганскай вайны аршанца Уладзіміра Правалінскага. Старшы прапаршчык, інструктар мотастралковага батальёна, ён амаль пяць гадоў прабыў там, дзе смерць за ім і яго баявымі сябрамі хадзіла, як кажуць, на пятах. А смерць, як вядома, тым больш на вайне, не шкадуе нікога і нікога не выбірае. І сярод тых, хто вярнуўся на Радзіму (прабачце нас родныя, блізкія, сябры іх) у цынкавых трунах (з песні слова не выкінеш), былі, на жаль, і нашыя землякі.

І сёння пра іх, маладых хлопцаў, хто, як пісаў паэт «ушли не долюбив, не докурив последней сигареты», напамінае помнік у гарадскім скверы на беразе Дняпра.

Але нішто ўжо не зможа вярнуць іх з сырой зямлі.

І колькі разоў давялося перажыць смерць сваіх баявых сяброў Уладзіміру Правалінскаму, якія гінулі побач, на вачах.

Бо не ў адным баі з душманамі давялося прымаць яму ўдзел. А ў аперацыі, што звязаная з горадам Хост і ўвайшла ў гісторыю афганскай вайны, быў паранены. Вызначыўся і ў іншых аперацыях. Медалі «За адвагу», «За выдатную воінскую службу» 2-й ступені, афганскі медаль «За сумесную аперацыю», падзякі камандавання гавораць самі за сябе.

Ён, як і многія яго саслужыўцы, і тады разумеў бессэнсавасць той вайны. Але ў арміі загады не абмяркоўваюць – іх выконваюць. Яны да канца засталіся вернымі воінскаму абавязку і прысязе. І таму нікому не дадзена права паракаць іх за тое…

**І. Коган**

На здымку: былы афганец У. Правалінскі